МАЗЫРСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

# КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ РАЗВІЦЦЯ МОВЫ, ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА Ў СВЯТЛЕ АДРАДЖЭННЯ КУЛЬТУРЫ І ДУХОЎНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

*Зборнік матэрыялаў Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі*

Мазыр 1998

# МАРАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧАЯ ТРАДЫЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

В.С.Болбас, С.В Болбас

Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут

У сілу гістарычных прычын эпоха сярэднявечча ў развіцці цывілізацыі была эпохай маральна-этычных пошукаў у напрамку больш дасканалай арганізацыі грамадскага быцця. Беларуская літаратура, як і іншыя ўсходнеславянскія літаратуры, якія зараджаліся ў гэты перыяд, палажыла ў падмурак свайго фарміравання маральна-выхаваўчы аспект. Маральна-павучальным сэнсам быў прасякнуты, бадай, кожны радок твораў айчынных пісьменнікаў. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца літаратурная спадчына аднаго з вялікіх пачынальнікаў – Кірылы Тураўскага. Айчынны Златаслоў атаясамліваў служэнне Богу з маральна-духоўным самаўдасканаленнем і ў гэтым бачыў сэнс чалавечага жыцця. Узровень маральнасці асобы, па яго перакананню, залежыць ад уласных намаганняў кожнага. Неабходнай жа і абавязковай умовай маральнага развіцця індывіда з'яўляюцца мудрасць, розум і веды для ўзбагачэння, удасканалення якіх самым надзейным і дзейсным сродкам з'яўляюцца кнігі. Кірыл Тураўскі пераконваў, што авалоданне багаццем кніжных ведаў аднолькава неабходна людзям любых узростаў і саслоў'яў.

Францыск Скарына таксама галоўную мэту выкарыстання кніжнага багацця бачыў у фарміраванні дасканалага чалавека. Прычым, дасканаласць разумелася ім у першую чаргу як маральна-духоўная дасканаласць. У сваіх прадмовах і пасляслоўях першадрукар тлумачыць, што галоўным крытэрыем маральнасці чалавека з'яўляюцца канкрэтныя справы, зробленыя дзеля агульнага дабра. Мэты і змест маральнага выхавання Ф.Скарына прапануе скіраваць у агульначалавечым накірунку. Паняцці дабра, справядлівасці, чалавекалюбства ён хоча распаўсюдзіць не толькі на прадстаўнікоў



пэўных саслоўяў, ці братоў у Хрысце, а нават і на "иноверцев", гэта значыць людзей наогул. У сваіх творах Ф.Скарына спрабуе распрацаваць і асноўныя шляхі маральнага выхавання. Побач з развіццём мудрасці як падмурка духоўнага развіцця, ён значнае месца ў фарміраванні маральнасці асобы адводзіць "метаду прыкладу".

Сучаснік Ф.Скарыны паэт-лацініст Мікола Гусоўскі лічыць, што сіла духу ёсць сапраўдная моц кожнага чалавека і любой дзяржавы. Ён засяроджваў увагу на тым, што дзейсным метадам маральнага выхавання з'яўляюцца практыкаванні і ў тым ліку прывучэнне ў здзяйсненні канкрэтных высокамаральных учынкаў. Маральная загартоўка, на думку паэта, з'яўляецца важным фактарам устойлівасці адпаведных паводзін. У паэме "Жыццё і подзвігі святога Гіяцынта" ён паказвае, як знешне здавалася б трывалыя ўстоі хрысціянскай веры былі ўшчэнт разбураны эпідэміяй чумы. У экстрэмальнай сітуацыі людзі звярнуліся да элементаў паганскай веры.

Аўтар першай славянскай граматыкі Лаўрэнцій Зізаній лічыў, што эфектыўнасць маральнага выхавання можа быць дасягнута ў тым выпадку, калі выхаванцам будзе зразумелы і даступны змест маральна-этычных ведаў і норм, якімі хочуць іх узбагаціць выхавальнікі. Глыбокія маральна-этычныя веды будуць садзейнічаць выпрацоўцы адпаведнай маральнай свядомасці, якая з'яўляецца асновай унутраных перакананняў асобы. Такім чынам, маральныя правілы грамадства выступяць не столькі знешнімі рэгулятарамі паводзін, а дапамогуць пашырэнню свабоды волі індывіда, якая не можа выходзіць з рэчышча вартасных арыентацый грамадства.

Падыходы айчынных пісьменнікаў сярэднявечча як бы падагульняў Сімяон Полацкі, які ў сваіх мастацкіх і філасофска-педагагічных творах малюе маральны ідэал асобы, раскрывае змест, шляхі і сродкі маральнага выхавання і патрабаванні да яго практычнай арганізацыі. Паэт указвае, што пры выхаванні асобы аднолькава важна ўздзейнічаць на свядомасць і пачуцці выхаванцаў. Эмацыянальнае ўздзеянне на чытача мастацкіх твораў дапама-

гае пераходу маральных ведаў у цвердыя перакананні. У гэтым плане Сімяон Полацкі засяроджвае ўвагу як на ўнутраным змесце твораў,так і на знешнім іх афармленні.

Паэт паказвае, што маральнасць асобы не передаецца ў спадчыну, а з'яўляецца вынікам працы над сабой кожнага чалавека. Строга і няўхільна кіруецца ён асноўнымі пастулатамі этыкі сярэднявечча і ментальнай асаблівасцю продкаў, калі ў абсалют узводзіць скіраванасць да супольнасці, абшчыннасці, агульнага дабра. Мастацкае ўвасабленне агульначалавечых маральных запаветаў у вобразах і ўчынках літаратурных герояў дапамагло Сімяону Полацкаму даходліва і пераканаўча паказаць, што ігнараванне індывідам маральных патрабаванняў грамадства заўсёды прыносіць шкоду і сабе і іншым.

Раскрываючы асноўныя станоўчыя якасці асобы, якія дапамагаюць чалавеку ўзняцца да вяршынь духоўнай дасканаласці, С.Полацкі акцэнтуе ўвагу і на адмоўных рысах і якасцях. Прычым апошнія, на думку паэта, з аднаго боку перашкаджаюць маральнаму развіццю асобы, а з іншага іх пераадоленне гартуе і мацуе дух чалавека. Сімяон Полацкі прыходзіў да слушнай высновы, што пачынаць выхаванне патрэбна з маленства. А перавыхаванне – шлях даволі цяжкі і не заўсёды выніковы.

Такім чынам,у беларускай літаратуры эпохі сярэднявечча досыць поўна і ўсебакова асвятляліся пытанні маральнага выхавання асобы. Творчыя набыткі айчынных пісьменнікаў і сёння маюць важнае не толькі пазнавальнае значэнне. Іх асобныя ідэі і падыходы можна з поспехам выкарыстоўваць у арганізацыі маральнага выхавання падрастаючых пакаленняў.



# АБ НЕКАТОРЫХ АСАБЛІВАСЦЯХ РАСКРЫЦЦЯ ТЭМЫ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў РУСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ 30-80-х ГАДОЎ

І.А.Варніна

Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут

У наш час многія літаратурныя з'явы, якія дагэтуль лічыліся бясспрэчнымі, зараз пераглядаюцца, пераасэнсоўваюцца. Да іх ліку адносіцца і тэма калектывізацыі, якая на працягу многіх год была ў цэнтры ўвагі і беларускіх, і рускіх пісьменнікаў.

Калі коратка нагадаць гісторыю яе развіцця ў літаратуры, то ўбачым, прыкладна, наступнае. Сама тэма з'явілася адразу ж пасля тых падзей, якія сталі называцца "вялікім пераломам". Да першага этапу яе развіцця, а гэта 30-50-я гады, адносяцца "Адшчапенец" Я.Коласа, "Новая дарога" С.Баранавых, "Мядзведзічы" К.Крапівы, "Вязьмо" М.Зарэцкага, "Спалох на загонах" П.Галавача – у беларускай прозе, а у рускай – "Нянавісць" І.Шухава, "Станіца" У.Стаўскага, "Катлаван" А.Платонава (на жаль, своечасова не надрукаваны/, і як кропка адліку, як эталон "Узнятая цаліна" М.Шолахава.

Мае рацыю даследчык М.Мушынскі, калі гаворыць, што "многія творы 20-30-х гадоў, пасляваеннага часу, у першую чаргу тыя, што звернуты да тэмы калектывізацыі, тэмы жыцця калгаснай вёскі, сёння патрабуюць перагляду, новага прачытання" /1, 5/. Гэта, перш за ўсё, адносіцца да такіх твораў 30-х гадоў, як "Вязьмо" М.Зарэцкага і "Ўзнятая цаліна" М.Шолахава. Цікава, што і напісаны яны былі адначасова ў 1932 годзе.

Пытанне аб правамернасці супастаўлення "Ўзнятай цаліны" і "Вязьма" ўжо ставілася ў нашым літаратуразнаўстве. Так, напрыклад, даследчык А.Майсеенка яшчэ ў 70-я гады пісаў: "У творы /у "Вязьме" - І.В./ моцна адчуваецца рашучы поступ часу, за лёсам асобных персанажаў, створаных часта з псіхалагічнай дакладнасцю і глыбінёй, мы заўсёды ўлоўліваем вялікую гістарычную эпоху ў яе выразных і велічных контурах. Эпічнасцю і маштабнасцю паказу сацыяльных падзей, майстэрствам псіхалагічнага і бытавога малюнка, каларытам масавых сцэн раман "Вязьмо" нагадвае "Ўзнятую цаліну" ... " /2, 59/. Аднак пытанне было пастаўлена ў самай агульнай форме. Параўнанне гэтых твораў тады яшчэ ледзь-ледзь дазвалялася. Сёння дарэчы ўдакладніць: у мастацкім асэнсаванні самой сутнасці калектывізацыі, яе канчатковай ацэнкі як гвалту над сялянствам М.Зарэцкі шмат у чым аказаўся больш смелым, рашучым, праніклівым, чым М.Шолахаў.Такая пастаноўка пытання, як мы лічым, дазваляе істотна ўдакладніць карціну сапраўдных літаратурных каштоўнасцей, гісторыю ўвасаблення